# ЛЯ ВЫТОКАЎ ФАРМІРАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ НАПІСАННЯ ПАДРУЧНІКАЎ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***С. М. Цемушаў***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, stepnikbsu@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца ўнёсак вядомага беларускага гісторыка Паўла Алегавіча Лойкі ў станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі. Прыведзены прыклады стварэння першых падручнікаў па гісторыі Беларусі, у якіх П. А. Лойка падрыхтаваў тэксты па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Вылучаны тыя новыя падыходы ў асвятленні розных падзей і з'яў у гісторыі Беларусі XIII–XVIII стст., якія дзякуючы гісторыку цяпер з'яўляюцца агульнапрызнанымі ў вучэбнай і навуковай літаратуры.

***Ключавыя словы:*** гістарычная адукацыя; вучэбныя дапаможнікі; установы агульнай сярэдняй адукацыі; гісторыя Беларусі; Павел Алегавіч Лойка; Вялікае Княства Літоўскае; Рэч Паспалітая.

# У ИСТОКОВ ФОРМИРОВАНИЯ ТРАДИЦИЙ НАПИСАНИЯ УЧЕБНИКОВ ПО ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ

***С. Н. Темушев***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, stepnikbsu@gmail.com*

В статье рассматривается вклад известного белорусского историка Павла Олеговича Лойки в становление отечественной системы школьного исторического образования. Приведены примеры создания первых учебников по истории Беларуси, в которых П.А. Лойко подготовил тексты по истории Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой. Выделены те новые подходы в освещении различных событий и явлений истории Беларуси XIII–XVIII веков, которые благодаря историку в настоящее время являются общепризнанными в учебной и научной литературе.

***Ключевые слова:*** историческое образование; учебные пособия; учреждения общего среднего образования; история Беларуси; Павел Олегович Лойко; Великое Княжество Литовское; Речь Посполитая.

# AT THE ORIGINS OF THE TRADITION OF WRITING TEXTBOOKS ON THE HISTORY OF BELARUS

***S. M. Tsemushau***

*Belarussian State University, Niezaležnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, stepnikbsu@gmail.com*

The article discusses the contribution of the famous Belarusian historian Pavel Olegovich Loiko to the formation of the national system of school history education. Examples of the creation of the first textbooks on the history of Belarus are given, in which P. A. Loiko prepared texts on the history of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish–Lithuanian Commonwealth. Those new approaches to the coverage of various events and phenomena in

the history of Belarus in the 13th–18th centuries, which, thanks to the historian, are now generally recognized in educational and scientific literature, are highlighted.

***Keywords:*** historical education; textbooks; institutions of general secondary education; history of Belarus; Pavel Alegovich Loika; Grand Duchy of Lithuania; Polish–Lithuanian Commonwealth.

У 2016–2021 гг. у нашай краіне была падрыхтавана новая лінейка падручнікаў (вучэбных дапаможнікаў) па айчыннай гісторыі. Асноўная ўвага ў навучальных дапаможніках «новага пакалення» па гісторыі Беларусі (з 6 па 11 клас) надаецца не зместу і інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў, а рэалізацыі прынцыпова іншай мэты адукацыі, якая, як уяўляецца сучасным спецыялістам у галіне педагогікі, у большай ступені адпавядае постіндустрыяльнай (інфармацыйнай) стадыі ў развіцці грамадства. Сёння навучанне гісторыі ў сярэдняй школе (установах агульнай сярэдняй адукацыі) на 2-й і 3-й ступенях арыентавана, перш за ўсё, на фарміраванне і развіццё шэрагу кампетэнцый [1]. У ліку апошніх ключавая роля адводзіцца інфармацыйна-камунікацыйным кампетэнцыям, якія прадугледжваюць здольнасць вучняў працаваць з інфармацыяй – прасцей кажучы, навучэнцы павінны не проста запомніць пэўны набор фактаў, але і зразумець іх узаемасувязь, паходжанне, знайсці прымяненне ў паўсядзённым жыцці. Да ліку найважнейшых асобасных кампетэнцый, якія таксама мяркуецца развіваць ў сучасных вучняў з дапамогай навучання айчыннай гісторыі, адносіцца фарміраванне патрыятызму і ўласнай грамадзянскай пазіцыі, ўсведамленне нацыянальнай ідэнтычнасці.

Уяўляецца, што шмат у чым мэты, якія пастаўлены перад сістэмай гістарычнай адукацыі ў апошнія гады, былі ў той ці іншай ступені рэалізаваны ў першых навучальных дапаможніках суверэннай Рэспублікі Беларусь. У дачыненні да развіцця асобасных кампетэнцый, звязаных з фарміраваннем патрыятызму, гэта не выклікае сумненняў. Дзесяцігоддзі грэбавання выхаваннем нацыянальнай ідэнтычнасці, замена вывучэння нацыянальных вытокаў пошукам агульных заканамернасцяў у развіцці грамадстваў усяго свету і афіцыйна абвешчанае дасягненне – стварэнне «савецкай нацыі» (паводле Канстытуцыі СССР 1977 г.) – вельмі негатыўна адбіліся на развіцці нацыянальнай культуры. Палітыка савецкага кіраўніцтва няўмольна вяла да страты гістарычнай памяці. Гэтаму ў значнай ступені спрыяла арганізацыя навучання гісторыі ў школах БССР.

Грандыёзныя перамены пачатку 1990-х гг. запатрабавалі ўнясення істотных карэктыў у змест сярэдняй адукацыі. У найбольшай ступені гэта тычылася вывучэння айчыннай гісторыі. У навучальныя планы быў унесены новы прадмет – гісторыя Беларусі, у сувязі з чым спатрэбілася ў

вельмі сціснутыя тэрміны падрыхтаваць навучальныя праграмы і, вядома, даць навучэнцам падручнікі.

У выбары аўтараў і праграм, і падручнікаў Міністэрства адукацыі ў той час кіравалася меркаваннямі найбольшай мэтазгоднасці з пункту гледжання спалучэння глыбокага ведання прадмета і арыентацыі на прыярытэт нацыянальнай складовай. Не дзіўна, што ў ліку аўтараў аказаўся і Павел Алегавіч Лойка.

Не менш значным для пачатку 1990-х гг., гэта значыць першага этапу станаўлення нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, быў адбор зместу новага навучальнага прадмета, якім з’яўлялася гісторыя Беларусі. Гэтая задача ў поўнай меры была аддадзеная на водкуп аўтарам падручнікаў. Па сканчэнні чвэрці стагоддзя становіцца зразумелым, наколькі важная задача была вырашана ў той час. Гістарычныя падзеі, персаналіі, даты (навучальныя элементы, карыстаючыся тэрміналогіяй педагогікі), якія трапілі ў тыя першыя навучальныя дапаможнікі па гісторыі Беларусі, назаўжды замацаваліся ў іх. У сувязі з гэтым можна ўпэўнена сцвярджаць аб поўнай пераемнасці, наколькі гэта магчыма ў сувязі са зменай персанальнага складу аўтарскіх калектываў, паміж падручнікамі розных пакаленняў. І тым больш становіцца зразумелай вялікая роля «першапраходцаў» ў справе стварэння нацыянальна арыентаваных падручнікаў па айчыннай гісторыі, якія паставілі арыенціры для ўсіх будучых аўтараў.

Арганізацыя навучання новаму прадмету не магла быць наладжана хутка. Толькі працэдура праходжання ўсіх інстанцый для атрымання рэкамендацыі Міністэрства (так званага «грыфа») займае амаль год, а трэба ўлічваць і час напісання тэкстаў самімі аўтарамі. Адукацыйны працэс нельга было спыніць, матэрыялы для забеспячэння навучання гісторыі Беларусі патрабаваліся неадкладна. Асобныя параграфы друкаваліся ў «Настаўніцкай газеце». А ўжо ў 1992–1993 гг. сталі з’яўляцца паўнавартасныя навучальныя дапаможнікі. Сярод іх быў і дапаможнік па гісторыі Беларусі XVI–XVIII стст. для 7-га класа П. А. Лойкі, падрыхтаваны ў выдавецтве «Народная асвета» [2] (выйшла неймаверным накладам у 220 тыс. асобнікаў). Дапаможнік быў падрыхтаваны ў вельмі кароткі час. Тым не менш да сённяшняга часу ён прызнаёцца найлепшым з усёй серыі [3, с. 453].

Безумоўна, першыя дапаможнікі па гісторыі Беларусі нельга было прызнаць дасканалымі, тым больш у параўнанні з выверанымі да апошняга слова і малюнка, меўшых больш дзясятка выданняў падручнікамі па

гісторыі СССР. У іх не было ілюстрацый, не былі ўзгоднены пытанні і заданні да параграфаў. Але было самае галоўнае – выдатныя тэксты, напісаныя на добрай беларускай мове, выразная сістэматызацыя матэрыялу, падзеленага на роўныя па аб'ёму раздзелы і параграфы.

Між тым з кожным перавыданнем удасканальваўся метадычны апарат, з'яўляліся ілюстрацыі, схемы, табліцы. У 1998 г. у выдавецтве «Народная асвета» выйшаў новы дапаможнік П. А. Лойкі па гісторыі Беларусі XVI–XVIII стст. для 7 класа (наклад 190 тыс. асобнікаў, ён не лічыцца перавыданнем, паколькі былі ўнесены істотныя змены) [4]. У 2000 г. рушыла ўслед другое выданне гэтага дапаможніка (67 тыс. асобнікаў) у тым жа выдавецтве [5]. І, нарэшце, у 2004 г. выйшаў у свет лепшы – па прызнанні і настаўнікаў, і вучняў – дапаможнік па гісторыі Беларусі перыяду ВКЛ, напісаны П. А. Лойкам і падрыхтаваны выдавецтвам БДУ. Ва ўніверсітэцкім выдавецтве значную ўвагу надалі ілюстрацыйным матэрыялам, схемах, табліцах, картам [6]. Да ліку найважнейшых вартасцяў новага навучальнага дапаможніка неабходна аднесці і старанна выверaны метадычны апарат – пытанні і заданні ў тэксце параграфаў да дадатковага матэрыялу і фрагментаў крыніц, пасля параграфаў для дамашняй работы вучняў (у іх падрыхтоўцы, акрамя самога Паўла Алегавіча, прымаў удзел С. В. Паноў).

Павел Алегавіч таксама прыняў удзел у напісанні навучальных дапаможнікаў для 10 класа – у той частцы, якая тычылася гісторыі беларускіх зямель у складзе ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Навучанне гісторыі ў 10–11 класах (у рамках так званага «другога канцэнтра») прадугледжвала больш высокі ўзровень тэарэтычнага асэнсавання, а таксама больш навуковы ўзровень выкладання, ацэнак падзей, з'яў і працэсаў. У 1997 г. з друку выйшаў навучальны дапаможнік для 10 класа «Гісторыя Беларусі: другая палова XIII – XVIII ст.» («Народная асвета», пад рэд. П. Ф. Дзмітрачкова), а ў 2002 г. – дапаможнік «Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст.» («Народная асвета», пад рэд. М. С. Сташкевіча) [7; 8]. Значная частка тэксту названых дапаможнікаў была напісана П. А. Лойкам.

Неабходна адзначыць, што Павел Алегавіч удзельнічаў у стварэнні навучальных дапаможнікаў і ў напісанні асобных падраздзелаў па гісторыі Беларусі таго перыяду, у якім быў безумоўным спецыялістам. Яго аўтарытэт у гэтых адносінах ніхто не мог аспрэчыць, што значна спрашчала праходжанне рукапісаў навучальных дапаможнікаў праз неабходныя інстанцыі для атрымання міністэрскага «грыфа» [9, с. 39]. Захапленне

Паўла Алегавіча гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (менавіта такой назве аддаваў ён перавагу, прычым слова «Княства» прынцыпова з вялікай літары) пачалося яшчэ ў студэнцкія гады і было пранесена праз усё жыццё [10, с. 316].

Якія ж новыя акцэнты ў асэнсаванні мінулага беларускіх зямель расставіў у сваіх падручніках П. А. Лойка? Адзначым, што менавіта гэтыя новыя ацэнкі характару тых ці іншых падзей, а таксама непрадузяты, аб'ектыўны разгляд розных з'яў у гісторыі Беларусі выклікалі крайняе непрыманне ў гісторыкаў старэйшага пакалення. Гэта добра відаць па крытычным разбору навучальных дапаможнікаў 1990-х гг. у гістарыяграфічным аглядзе П. Т. Петрыкава, які папракаў з нагоды таго, што школьнікі вымушаныя засвойваць «няпраўдзівыя, скажоныя старонкі сваёй гісторыі» [11, с. 232].

Найбольш прынцыповай навіной, якая карэнным чынам адрознівае навучальныя дапаможнікі П. А. Лойкі ад папярэдніх падручнікаў для беларускай сярэдняй школы, з'яўлялася прызнанне беларуска-літоўскага характару Вялікага Княства Літоўскага, трактоўка ВКЛ як Беларуска-Літоўскай дзяржавы. У гэтых адносінах П. А. Лойка працягваў традыцыю папярэднікаў – гісторыкаў першых гадоў савецкай улады, у тым ліку У. І. Пічэты. Але зыходзячы з марксісцкага ўяўлення аб сутнасці гістарычных працэсаў, трывала і зусім некрытычна засвоеных у савецкай гістарыяграфіі, у аснове характарыстыкі тых ці іншых з'яў знаходзілася класавае супрацьстаянне («антаганізм»). Паколькі ж вярхоўная палітычная ўлада ў ВКЛ была ў руках літоўскіх феадалаў, вялікіх князёў-літоўцаў, то гэту дзяржаву варта называць прынамсі літоўска-беларускай, а лепш – паводле афіцыйнай назве – «Вялікім княствам Літоўскім і Рускім» [11, с. 230]. Нельга адмаўляць глыбокае захапленне П. А. Лойкам гісторыяй ВКЛ, якому ён адводзіў вырашальную ролю ў фарміраванні і беларускай дзяржаўнасці, і беларускага этнасу. Але ўважлівае вывучэнне тэкстаў гісторыка выяўляе асцярожнае і заўсёды карэктнае выкарыстоўванне тэрміналогіі. Так, беларускі гісторык і педагог прапанаваў такую абсалютна аб'ектыўную фармулёўку ў дачыненні да ВКЛ, як «дзяржава нашых продкаў» [6, с. 5].

Іншай навіной афіцыйнага дзяржаўнага навучальнага дапаможніка стала выкарыстоўванне паняцця «ліцвіны» (у палітычным, дакладней, дзяржаўным яго значэнні). На старонках першых дапаможнікаў П. А. Лойкі часта сустракаюцца паняцці «ліцвінскія зямлі» [6, с. 20], «ліцвінскія ваяры» [6, с. 22], «ліцвінскі патрыятызм» [6, с. 34], таксама і «Польска-Ліцвінская дзяржава» [6, с. 39, 55]. Гісторык сцвярджаў, што і «самасвядомасць

большасці беларускай шляхты ў XVII–XVIII стст. заставалася ліцвінскай» [6, с. 55]. Прынятае абазначэнне Рэчы Паспалітай як «дзяржавы абодвух народаў» П. А. Лойка разумеў, як дзяржаву палякаў і ліцвінаў. Разам з тым П. А. Лойка пісаў аб фарміраванні ў рамках Рэчы Паспалітай новай сацыяльна-палітычнай супольнасці «народа шляхецкага». Падобная выснова, прапанаваная для засваення навучэнцамі сярэдняй школы, была заснавана на глыбокім веданні крыніц і характару той эпохі, калі ўяўленне аб этнічнай і палітычнай ідэнтычнасці чалавека значна адрознівалася ад сучаснага. Не адмаўляюцца ад падобнай характарыстыкі этна-палітычных працэсаў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII стст. і сучасныя аўтары новага навучальнага дапаможніка па гісторыі Беларусі для 7 класа.

У навучальных дапаможніках П. А. Лойкі можна выявіць і новы погляд на характар знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай і ваенна-палітычных падзей XVI–XVII стст. Шмат увагі надзяляў аўтар і наступствам знішчальных для беларускіх земель войнаў, выяўленых у лічбах. Між тым трэба адзначыць, што гэтыя высновы не знайшлі поўнай падтрымкі гісторыкаў з-за некарэктнай, як адзначалася, экстрапаляцыі дадзеных па найбольш пацярпелых паветах на ўсю тэрыторыю Беларусі, з-за таго, што гісторык не ўлічваў ўздзеяння эпідэмій, голаду і г.д., прама не звязаных з сутыкненнямі варожых бакоў [11, с. 235]. Аднак у тэкстах П. А. Лойкі зусім няма сцвярджэння, якое яму прыпісваецца. Інфармацыя, якую ён прыводзіць, гучыць наступным чынам: «За няпоўныя дваццаць гадоў колькасць насельніцтва ў Беларусі скарацілася з 2,9 млн чалавек да 1,4 млн» [6, с. 113]. Такім чынам, у аўтарскім тэксце скарачэнне насельніцтва прама не звязваецца выключна з наступствамі ваенных дзеянняў. Увогуле, трэба было валодаць пэўнай смеласцю, каб непрадузята пісаць пра жахлівы («жудасны», карыстаючыся лексікай Паўла Алегавіча) час «патопу» XVII ст.

П. А. Лойка ў сваіх навучальных дапаможніках ажыццявіў прынцыповае пераасэнсаванне храналогіі, характару і наступстваў казацка-сялянскай вайны сярэдзіны XVII ст., якую для гісторыі Беларусі ён прапанаваў датаваць 1648–1651 гг. Тым самым, гісторык адмовіўся ад пануючай раней характарыстыкі тых падзей, як нацыянальна-вызваленчай вайны народных мас Украіны і Беларусі 1648–1654 гг. Такі погляд, непрымальны для гісторыі беларускіх земель, з часу першых дапаможнікаў Паўла Алегавіча знік і з вучэбнай, і з навуковай літаратуры.

Свой арыгінальны падыход прапанаваў П. А. Лойка адносна характарыстыцы паўстання Тадэвуша Касцюшкі. Гісторык звязаў гэтую

падзею з гісторыяй Беларусі, адмовіўшыся ад пануючага ўяўлення аб выключна польскім яе характары. У тагачасных падручніках Касцюшка быў аднесены да ліку аднаго з «сыноў роднай Бацькаўшчыны» (напрыклад, у дапаможніку 2004 г.).

Імкненне П. А. Лойкі да аб'ектыўнасці ў тлумачэнні прычын найважнейшых падзей і з'яў у гісторыі Беларусі праявілася ў выяўленні праблем у функцыяніраванні праваслаўнай царквы напярэдадні падпісання Брэсцкай царкоўнай уніі. П. А. Лойка зрабіў спробу даць усебаковую ацэнку рэлігійнай сітуацыі на беларускіх землях у канцы XVI ст. Падобны погляд характэрны і для сучасных падручнікаў [6, с. 70].

Да ліку найважнейшых заслуг П. А. Лойкі ў выкладзе айчыннай гісторыі для сярэдняй школы стала акцэнтаванне ўвагі на ўклад у развіццё беларускай культуры Францыска Скарыны, якога гісторык называў «вялікім пачынальнікам» і «тытанам Адраджэння» [6, с. 86]. З першых выданняў дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, якія ўключаюць перыяд першай паловы XVI ст., жыццю і дзейнасці Ф. Скарыны прысвячаецца асобны параграф [12, с. 33].

Напрыканцы хацелася б спыніцца яшчэ на адной істотнай вартасці тэкстаў навучальных дапаможнікаў Паўла Алегавіча, а менавіта – на яго багатай і разнастайнай беларускай лексіцы. На старонках дапаможніка Паўла Алегавіча сустракаюцца словы «ваяр», «параза», «вершнік», «хаўрус», якія не былі характэрны для ранейшых вучэбных тэкстаў (як і сучасных). І ў гэтым выпадку выявілася імкненне гісторыка да аб'ектыўнасці у адлюстраванні рэалій далёкага ад нас часу.

У цэлым неабходна аддаць належнае сапраўды фундаментальнаму ўнёску Паўла Алегавіча Лойкі ў стварэнне першага пакалення падручнікаў па гісторыі Беларусі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і шырэй – для станаўлення нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў нашай краіне.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Темушев С. Н. Особенности отбора содержания и построения методического аппарата учебного пособия по истории Беларуси для 6-го класса // Проблеми сучасного підручника: зб. наук. праць / Ред. кол.; голов. ред. О. М. Топузов. Київ: Педагогічна думка, 2018. Вип. 20. С. 462–472.

2. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. для 7-га кл. сярэд. шк. Мінск: Народная асвета, 1993.

3. Варонін В. А. Павел Лойка: (12.07.1958–22.10.2010) // Беларускі гістарычны агляд: навуковы часопіс. 2010. Т. 17, сшыткі 1/2. С. 451–454.

4. Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: Вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. шк. / Пад рэд. Г. Я. Галенчанкі. Мінск: Народная асвета, 1998.

5. Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: Вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання. 2-е выд. Мінск: Выд. дзярж. прадпрыемства "Народная асвета", 2000.
6. Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: Вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання. Мінск: Выд. цэнтр Беларус. дзярж. ун-та, 2004.
7. Гісторыя Беларусі: другая палова XIII – XVIII ст.: Вучэб. дапам. для 10-га кл.: У 2 кн. / Г. Я. Галенчанка, П. А. Лойка; пад рэд. П. Ф. Дзмітрачкова. Мінск: Народная асвета, 1997. Кн. 2
8. Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: Вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / Г. В. Штыхаў, П. А. Лойка, І. А. Аўдзееў і інш. Мінск: Выд. рэсп. унітар. прадпрыемства "Народная асвета", 2002.
9. Голубеў В. Ф. Памяці сябра, Паўла Алегавіча Лойкі // Беларускі гістарычны часопіс: навукова-тэарэтычны, навукова-метадычны часопіс. 2011. № 9. С. 37–41.
10. Сосна У. А Памяці гісторыка-медыявіста Паўла Алегавіча Лойкі (12.07.1958–22.10.2010). Беларускія сяляне і шляхта ў даследаваннях Паўла Лойкі // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. Вып. 3. Минск.: РИВШ, 2010. С. 315–324.
11. Петриков П. Т. Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е – начало 2000-х годов). Минск: Белорусская наука, 2007.
12. Гісторыя Беларусі: 7-ы кл.: Эксперым. падручнік для шк. з бел. і рус. мовамі навучання. Мінск: Часоп. "Адукацыя і выхаванне", 2000.

## РОЛЬ СИСТЕМЫ ОБРАЗОВАНИЯ В ГЛОБАЛЬНОЙ ПОЛИТИКЕ АМЕРИКАНСКОГО НЕОКОНСЕРВАТИЗМА

***И. И. Шумский***

*Белорусский государственный университет*
*пр. Независимости, 4. 220030, г. Минск, Беларусь, szumtski@bsu.by*

В статье рассматривается американский неоконсервативный опыт реформирования системы образования, анализируется влияние глобализации и академической мобильности на социальную сферу государств-реципиентов. Особое внимание уделяется экспортно-ориентированной деятельности американских университетов в рамках политики «мягкой силы». Изучается опыт English Medium Instruction на международном рынке образовательных услуг.

***Ключевые слова:*** неоконсерватизм; система образования; глобальная политика; Соединенные Штаты Америки.

## ROLE OF THE EDUCATION SYSTEM IN THE GLOBAL POLITICS OF THE AMERICAN NEOCONCERVATIVES

***I. I. Shumski***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, szumski@bsu.by*